ВОЛЬНЫЙ ТРУД
БЕЛОСТОК
18 СЕН. 40

18 верасня 1940 года № 216 (285).

# У ДЗЯРЖАЎНЫМ ПОЛЬСКІМ ТЭАТРЫ БССР

**Гутарка з мастацкім кіраўніком тэатра тав. А. М. ВЕНГЕРКА**

У Мінск прыехаў мастацкі кіраўнік Польскага Дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР, вядомы польскі рэжысёр Аляксандр Мечыслававіч Венгерка. Гэты малады тэатр, створаны пасля выгнання польскіх паноў з Заходняй Беларусі, паспеў ужо заваяваць шырокую папулярнасць сярод працоўных.

Тав. А. М. Венгерка ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» расказаў аб тым, над чым працуе тэатр, якія яго перспектывы.

— Польскі тэатр,—сказаў ён,—пачаў жыць поўнацэнным мастацкім жыццём са студзеня гэтага года. У нашым рэпертуары пяць п'ес і адзін своеасаблівы канцэрт — літаратурны мантаж, складзены з лепшых твораў польскай класічнай літаратуры і вялікага драматурга Шэкспіра. Працоўныя высока ацанілі якасць нашай работы. Спектаклі ў Гродне, Беластоку і Пінску прайшлі з вялікім поспехам. Рад канцэртаў мы далі на фабрыках і заводах, дзе яшчэ бліжэй пазнаёміліся з гледачом.

Тэатр у сучасны момант знаходзіцца ў Беластоку, дзе днямі паказаў прэм'еру «Панна Малічэўская»— Г. Запольскай, аўтара «Маралі пані Дульскай». Як у першай, так і ў другой п'есе бічуецца «мараль» мяшчанства.

Цяпер ідзе ўзмоцненая работа над першай савецкай пастаноўкай «Аптымістычная трагедыя»—В. Вішнеўскага. З аўтарам устаноўлен творчы кантакт. Тав. Вішнеўскі абяцаў прыехаць на прагляд спектакля. Бліжэйшымі нашымі пастаноўкамі будуць «Казка» —Светлова і «Вяселле Фігаро» — Бамаршэ. Да канца года тэатр пабывае ў Беластоку, Брэсце і Гродне.

— Выключную ўвагу, — сказаў далей тав. Венгерка, — мы ўдзяляем выхаванню маладога актора. У калектыве ёсць рад таленавітых маладых актораў, якія пачалі сваю творчую дзейнасць у нашым тэатры. Ролі Фердынанда і Луізы ў п'есе «Каварства і каханне» — Шылера выконваюць акторы Петрашкевіч і Касабуцкая, якія ніколі раней не ігралі на сцэне. У п'есе «Панна Малічэўская» галоўную ролю іграе Міхальская, якая таксама ніколі не выступала ў тэатры. Міхальская аказалася адаронай актрысай. Поспех яе ў спектаклі велізарны. Мы будзем развіваць работу ў гэтым напрамку.

Калектыў працуе з вялікім уздымам. Ён будзе рабіць усё, каб вывесці тэатр у рады лепшых савецкіх тэатраў. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, савецкая грамадскасць аказваюць нам усямерную дапамогу ў творчым росце, ствараюць усе неабходныя ўмовы для плённай дзейнасці.

У заключэнне тав. Венгерка сказаў, што польскім савецкім пісьменнікам, якія жывуць у БССР, пара сур'ёзна падумаць аб тым, каб ствараць для польскага тэатра арыгінальныя савецкія п'есы.